пашаны тысячагоддзямі народнага вопыту. І слова яго простае і гучнае, узбуджанае і сакавітае, даходзіць да сэрца дзіцяці.

Высокі, лірычны пафас Васіля Віткі спалучае ў сабе і фантазію, і рэальнасць. Яго творы вучаць дзяцей быць пільнымі, уважлівымі да слова, учынку, дзеяння, прыроды, навакольнага жыцця. Яны прымушаюць задумацца, паглядзець на сябе з боку, ацаніць сябе і асэн-саваць пытанні:» Што я за чалавек?, Навошта прыйшоў на гэтую зямлю?, У чым мае прызначэнне?» Гаворка з дзецьмі ідзе сур'ёзна, без падману, з вялікай павагай да асобы маленькага чытача. Ідэалам для В.Віткі з'яўляец-ца чалавек, які не забыўся пра сваіх родных, помніць і паважае сваіх продкаў, ведае свае карані. Звяртаючыся да чытачоў, паэт піша: «Маці, бацька, браты, сястра. Яны твае самыя родныя, блізкія. Добра, калі ў цябе ёсць бабуля, дзядуля -- гэта з самага малку твае дарагія сямейнікі...» І далей: «Ці задумваўся ты, адкуль пайшоў твой род, адкуль пачалася дарога ў жыццё?

Бо твая памяць -- гэта памяць твайго роду, а над ёю -- памяць народа-- вялікая кніга, якая называецца гісторыяй.

Род і народ яднаюцца адным дарагім словам -- Радзіма".

Вось так проста і мудра падводзіць пісьменнік дзяцей да важных і складаных паняццяў.

Варта зазначыць, што ўжо ў першым сваім творы «Вавёрчына гора» матывы сямейнасці, паняцце, якое на доўгія гады страціла сваю існасць, гучаць моцна і ўсхвалявана.

Жаданне дапамагчы роднаму, блізкаму аб'ядноўвае ўсіх герояў гэтай цудоўнай казкі. Так яно і павінна быць, чуем мы мудры голас В.Віткі. Падзеі ў казцы развіваюцца імкліва. Кожная дэталь, кожны вобраз індывідуальныя, мова сакавітая -- ідзе гульня, якая захоплівае дзіця, якая прымушае яго дзейнічаць, суперажываць. Тэлеграму з маланкай нельга паслаць: «... не працуе бесперастанку... на пасылках маланка». Адзіны спадзяванак -- дождж. І вось: «З лістка на лісток пацёк ручаёк». Стары воран-каваль атрымаў тэлеграму. Зрабіў малаточак. Выручылі вавёрачку родныя і сябры.

Расказваючы дзецям пра міласэрнасць, спачуванне, смутак, радасць, В.Вітка не імкнецца выдавіць у іх слязу. Дзеці адчуваюць і гульню, і фантастычную перабольшанасць, і незвычайную падачу матэрыялу: тут і незавершаныя сказы, і паўторы, падоўжаны перабор словам, якi так уласцівы ім самім.

У шматгранай творчасці В.Віткі ёсць шэраг твораў, якія дапамагаюць дзецям расці, станавіцца людзьмі. Ці то загадка, ці то лічылка, ці то жарт -- усюды пісьменнік прадстае як майстра роднага слова, мудры парэшнік, вясёлы чарадзей. Творы яго вучаць спасцігаць народны дух мовы, этыкі і маралі, а значыць, выхоўваць дзяцей.

Плача коця на кухні,
Ад слёз вочкі папухлі:
-- Што з табою, мой каток,
-- Забалеў мо жываток?
-- М-мяў, -- сказаў варкоцік, --
Не баліць жывоцік.
У мяне душа баліць,
Як пярэр на свеце жыць.
Як мне жыць у хаце,
Калі хлусіць Каця,
Смятану злізала --
На мяне сказала.

Нават у гэтым невялічкім вершы -- сур'ёзная праблема, і вырашыць яе даручана дзецям. Глыбока ведаючы, разумеючы і паважаючы дзіця, пісьменнік праз гульню, вясёлы, дабрадушны гумар вядзе яго да пазнання ісціны.

Вітка нсяк зазначыў, што «эмацыянальная сіла ўздзеяння слова, вышыня яго напружання вымяраюцца адной-адзінай свячой -- свячой чалавечай душы». Менавіта чалавечнасць ляжыць у аснове гуманістычнай канцэпцыі пісьменніка.

Глінnік Т.М.,
канд. пед. навук,
дацэнт

## ПЫТАННІ АДРАДЖЭННЯ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ МЭНЕДЖЭРАЎ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ

У мінулым Беларусі ёсць шмат чаго цікавага і каштоўнага. У гэтым сэнсе культурна-гістарычная спадчына, шматвяковая гісторыя яе стварэння і існавання адкрываюць новыя старонкі жыцця нашых продкаў. Мы ўжо ўразумелі, што асноўнай прычынай крызісу культуры з'яўляецца ідэя яе адмаўлення, змянення (прычым гвалтоўнага), якая знайшла сваё яскравае ўвасабленне ў канцэпцыі «культурнай рэвалюцыі». Згодна з гэтай ідэяй адмаўленне і разбурэнне «старой буржуазнай» культуры неабходна для стварэння новай. Знішчаліся не толькі культурныя каштоўнасці, помнікі, але і іх носьбіты і вытворцы, галоўным чынам інтэлігенцыя, барацьба з якой, мабыць, не скончыцца ніколі. На вёсцы своеасаблівая культура селяніна, заснаваная на любві і павазе да працы, да зямлі, у выніку сталінскіх «сацыялістычных пераўтварэнняў вёскі» стала называцца «культасветам», «культурным абслугоўваннем» і іншымі савецкімі неалагізмамі. Менавіта на лёсе Беларусі, яе культуры гэта добра відаць. Ігнараванне сутнасці культуры -- яе захаванне і ўзбагачэнне -- зрабіла непапраўнае: змяненне як асноўны прынцып «культурнай рэвалюцыі» ў рэальным жыцці стаў спосабам яе разбурэння.

Аптымізацыя сучаснага культурнага жыцця, асабліва на ўзроўні рэгіёна, духоўнае яго адраджэнне



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

прадугледжваюць неабходнасць аднаўлення, запатрабавання культурна-гістарычнай спадчыны, каштоўнасцей, як мага хутчэйшага ўключэння іх у сучасныя культурныя працэсы. Вялікай дапамогай у гэтай справе павінен стаць адзін з апошніх законаў Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», які вызначае ўмовы духоўнага, інтэлектуальнага і эканамічнага развіцця грамадства з мэтай захавання, належнага ўтрымання, рацыяналь-нага выкарыстання, аднаўлення і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны. Менавіта ў Законе ўпершыню вызначаецца паняцце гісторыка-культурнай спадчыны як сукупнасці адметных вынікаў і сведчанняў гістарычнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях, даецца новая класіфікацыя каштоўнасцей. Можа некаторыя даследчыкі і знойдуць гэты Закон не зусім дасканалым. На наш погляд, асноўныя яго палажэнні могуць, з аднаго боку, стаць зместам некаторых напрамкаў сацыякультурнай дзейнасці менавіта таму, што культурна-гістарычная спадчына, каштоўнасці, апрабаваныя гістарычным вопытам шматлікіх пакаленняў, адпавядаюць высокім запатрабаванням гуманізму. З другога боку, у якасці сацыякультурных стабілізатараў магчыма разглядаць усё тое, што нясе ў сабе асаблівасці насельніцтва рэгіёна, звычаяў, традыцый, свят і абрадаў. Як мы бачым, пытанні культурна-гістарычнай спадчыны знаходзяцца якраз на стыку шматлікіх навук, дзе, як вядома, могуць з'яўляцца самыя цікавыя нечаканасці і адкрыцці. Асобныя раздзелы гісторыі і тэорыі беларускай культуры распрацоўваліся інстытутамі гісторыі, філасофіі, мастацтвазнаўства, мовазнаўства, літаратуры Акадэміі навук Рэспублікі Беларусь і шматлікімі даследчыкамі. Мы лічым, што неабходна комплексна падысці да вывучэння і выкладання не толькі культурна-гістарычнай спадчыны, але і іншых курсаў сацыякультурнай дзейнасці, якія ажыццяўляюцца кафедрай мэнеджмэнту сацыякультурнай сферы Беларускага універсітэта культуры. Менавіта ад таго, як будуць выхаваны і падрыхтаваны выпускнікі універсітэта, залежыць і вырашэнне пакуль што праблематычнага пытання -- быць беларусам на свеце ці не быць. Не без падстаў мы нагадваем словы нашай славутай і пакутнай суайчынніцы Ларысы Геніюш:

На роднай зямельцы
Ўсе мы не госці,
Усе мы чыесьці, усе мы кагосьці.
Хоць спарахнелі дзядоў нашых косці,
У нашай натуры ёсць іхняе штосьці.

Макарава А.А.,
ст. выкладчык
Сівурава Л.П.,
супрацоўнік Беларускага
інстытута праблем культуры

## САЦЫЯЛЬНАЯ РОЛЯ ДЗЯРЖАЎНЫХ УСТАНОЎ ПА АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ І ПРАБЛЕМЫ МЕТАДЫЧНАГА КІРАЎНІЦТВА ІХ ДЗЕЙНАСЦЮ Ў СУЧАСНЫХ УМОВАХ

Менавіта з нагоды надзённасці гэтых праблем і неабходнасці іх вырашэння быў створаны Рэспубліканскі савет дырэктараў навукова-метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурных цэнтраў па арганізацыі вольнага часу, які на працягу года дзейнічае пры Беларускім інстытуце праблем культуры. Чарговае яго пасяджэнне, што адбылося нядаўна на Магілёўшчыне, як і папярэднія сустрэчы вядучых спецыялістаў навукова-метадычных служб рэспублікі, яшчэ раз пацвердзілі патрэбу ў пераасэнсаванні сацыяльнай ролі дзяржаўных клубных установаў у прынцыпова новым разуменні сутнасці культурнай работы па арганізацыі вольнага часу.

Зразумела, што без адпаведнага навуковага погляду на сучасныя праблемы гэтай сферы зараз немагчыма вызначыць усе шляхі і накірункі развіцця дзяржаўных клубных установаў. Але ўжо сёння відавочна, што клубныя ўстановы розных тыпаў з'яўляюцца перш-наперш цэнтрамі арганізацыі самадзейнай творчасці і культурнага адпачынку грамадзян рэспублікі. Нельга не пагадзіцца з думкаю, што каштоўны сацыяльны здабытак, якім для грамадства з'яўляецца вольны час, пры нізкай культуры яго арганізацыі і ненапоўненасці шматлікімі відамі і формамі заняткаў, ператвараецца ў вялікую сацыяльную небяспеку.

Сучасная практыка, на думку вядучых спецыялістаў-членаў Рэспубліканскага савета, патрабуе сёння ад навукоўцаў абгрунтаваных праектаў развіцця культурнай сферы з улікам рэгіянальна-нацыянальных і культурна-гістарычных асаблівасцей. Гэтая ж практыка дыктуе неабходнасць навукова-метадычных распрацовак па стварэнню розных тыпаў установаў культуры і мадэляў іх дзейнасці з улікам разнастайнасці інтарэсаў усіх груп насельніцтва.

Даволі востра паўстае таксама праблема навукова-метадычнага кіраўніцтва дзейнасцю установаў культуры па арганізацыі вольнага часу. Дарэчы, у сучасны момант у рэспубліцы дзейнічае 4687 розных установаў клубнага тыпу. Зразумела, што ўдасканальванне агульнага прафесійнага майстэрства арганізатараў сама-дзейнай творчасці, культурна-забаўляльных праграм і адпачынку ў значнай меры залежыць ад інфармацыйна-метадычнага забеспячэння культурнай сферы ўвогуле. Менавіта навукова-метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтрам культуры па